ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 283 (1250) ПАНЯДЗЕЛАК, 8-га сьнежня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Бэрлін у палоне рэвалюцыйных дэманстрацый

БЭРЛІН, 5. Ва ўсіх частках гораду адбыліся вялікія мітынгі рабочых прадпрыемстваў і беспрацоўных. Ва многіх мясцох адбыліся сутычкі паміж дэманстрантамі і паліцыяй. Паліцыя, пусьціўшы ў ход дубінкі і аружжа, разагнала шэраг працэсій.

Увечары 5-га адбыліся дзьве вялікія дэманстрацыі ў Заходнім квартале Бэрліна (буржуазны квартал) і на Александраўскай плошчы, дзе знаходзіцца паліцэйская ўправа.

Усе вуліцы былі заняты паліцэйскімі патрулямі і, ня гледзячы на гэта, на пляцу адбылася шматлікая дэманстрацыя. Недалёка ад дому нямецкай компартыі адбыліся сур'ёзныя сутычкі. Паліцыя адкрыла страляніну па дэманстрантах. Паліцэйскія, пад камандай паліцэйскага афіцэра, уварваліся ў 4 рабочыя кватэры і разгрáмілі абстаноўку.

Справа „Прамысловай партыі“

АД ІМЯ МІЛЬЕНАЎ ПРАКУРОР ПАТРАБУЕ РАСТРАЛЯЦЬ ТЫХ,

хто хацеў патапіць у крыві масы працоўных,

хто рыхтаваў узброены напад на краіну пролетарскай дыктатуры

„Усё тое, што ў нас, у СССР, можа дапамагаць і аказваць садзейнічаньне варожаму нам сьвету, павінна быць зьмецена і зьнішчана раз назаўсёды“

Прамова дзяржаўнага абвінаваўцы тав. Крыленка*)

Канчаючы сваю прамову, т. Крыленка гаворыць:

— Мы сьмела глядзім уперад. Мы сьмела глядзім на будучыню. Аб гэтым сьведчаць адносіны працоўных мас СССР да гэтага працэсу. Гэтыя масы могуць сказаць, што ў выпадку неабходнасьці, у выпадку, калі цяжкая гадзіна настане, мы будзем абараняць СССР усе ад мала да вяліка—рабочыя, сяляне, жанчыны і мужчыны. Ня знойдзецца ў шэрагах працоўных нашай краіны ні аднаго чалавека, які ва ўмовах, калі пытаньне аб інтэрвэнцыі ставіцца так, як ставіць яго Дэтэрдынг, а іменна як пытаньне месяцаў, ня сказаў-бы, што будучыя сутычкі, калі яны наступяць, СССР сустрэне ва ўсім узброеньні, у поўнай баявой гатоўнасьці. Вынікі гэтых сутычак могуць быць такія, якія наўрад ці лічваюць паны інтэрвэнты. Тады мы ім скажам;—„Ты гэтага хацеў, Жорж Дандэн“.

У далейшым тав. Крыленка прыступае к вызначэньню ступені соцыяльнай небясьпекі кожнага з падсудных паасобку. Ён пачынае з характарыстыкі асобы галоўнага з абвінавачаных—Рамзіна. Гэты прафэсар вышэйшага тэхнічнага вучылішча, інтэлігент, вучань проф. Кірша, які ўспрыняў ад свайго настаўніка вялікія веды ў той галіне, у чым мае кроўную патрэбу краіна, быў актыўным удзельнікам, зьбіральшчыкам і організатарам контррэволюцыйнай організацыі, меў цесную сувязь з белагвардзейскай эміграншчынай і дзеячамі француcкай контрразьведкі.

Ён актыўна кіраваў падрыхтоўкай узброенага нападу чужаземных войск з мэтай ніэрынуцьця савецкай улады з усімі вынікамі гэтага для рабочае клясы і працоўных мас СССР.

Што ўяўляе сабою Рамзін? Актыўны сабатажнік у мінулым, пасьля ліквідацыі грамадзянскай вайны ён быццам-бы стаў на савецкую пляцформу. Але нельга паверыць шчырасьці яго прымірэньня з савецкай уладаю ў гэты момант. Пасьля скончэньня грамадзянскай вайны для такога тыпу сабатажнікаў ня было другога выхаду, як толькі пайсьці на службу да савецкай улады. Нельга верыць Рамзіну па павадзе яго быццам-бы ідэолёгічных пабуджэньнаў і яго перараджэньня. Рамзін не з такіх людзей. Рамзін—тыповы практык, чалавек справы. Ён быў і застаўся актыўным контррэволюцыянэрам, актыўным ворагам савецкай улады. Але ён падыходзіў да гэтага пытаньня па-дзялецку. У гэтым ключ да разуменьня Рамзіна. Ён добра ўлічваў усе абставіны, бязумоўна меціў на міністэрскі портфэль, хаця ён і імкнецца адмаўляцца ад гэтага. У асобе Рамзіна мы мелі яркі тып палітычнага авантурыстага.

Такі Рамзін, актыўны шкоднік, актыўны кіраўнік контррэволюцыйнай організацыі, шпіён, змоўшчык, які сьвядома падрыхтоўваў уварваньне чужаземных войск у СССР з мэтай патапіць у крыві масы працоўных, здраднік у апошні момант свайго быццам-бы „чыстасардэчнага каяньня“ утаіўшы шэраг важнейшых даных аб практычнай падрыхтоўцы плацдармаў для інтэрвэнтаў. Усё гэта ня можа выклікаць ні малейшага хістаньня ў тым, што соцыяльная небясьпека Рамзіна патрабуе бязумоўнай, поўнай ліквідацыі гэтай небясьпекі, не ў інтарэсах помсты, а выключна па меркаваньнях палітычнай мэтазгоднасьці.

Тав. Крыленка пераходзіць далей да вызначэньня соцыяльнай небясьпекі астатніх падсудных.

Гаворачы аб конкрэтных мерах рэпрэсій, тав. Крыленка падкрэсьлівае, што ў даным выпадку ня можа быць такой пастаноўкі пытаньня: чыя віна больш, таму адплаціць больш, чыя віна менш, таму адплаціць менш. Мы павінны ў кожным даным выпадку вызначыць найбольш мэтазгодныя захады, выходзячы з агульных задач самаабароны пролетарскай дзяржавы супроць контррэволюцыйных замахаў. Мы можам і павінны выходзіць з вучоту ўсёй савакупнасьці абставін сёньняшняга дню і заўтрашняга дню, які таксама можа наступіць. Наш суд зьяўляецца зброяй дыктатуры рабочае клясы.

Тав. Крыленка зноў у агульных рысах напамінае сутнасьць той чорнай справы, якую пры дапамозе інтэрвэнцыі зьбіраліся ажыцьцявіць падсудныя, і працягвае:

— Але калі справа пераходзіць у простую барацьбу, калі замест самага элемэнтарнага, мінімальнага нэйтралітэту мы маем простую ўзгодненасьць дзейнасьці з інтэрвэнтамі, пытаньне ясна: ніякіх хістаньняў тут быць не павінна.

Мільённыя масы рабочае клясы надсылаюць свае вітаньне органу, які выкрыў дзейнасьць гэтай групы, вартаўніку рэволюцыі—АДПУ. Мільённыя масы выказваюць сваю гатоўнасьць стаць грудзьмі на абарону СССР, скласьці галаву за права і магчымасьць будаваць сваю соцыялістычную бацькаўшчыну так, як яны жадаюць і ўмеюць. Масы сусьветнага пролетарыяту таксама глядзяць на СССР, як на шляхаводную зьвязду ў барацьбе за вызваленьне чалавецтва. Калі ў барацьбе супроць нас узьнімаюцца і консолідуюцца сілы аджываючай свой век буржуазіі, калі міжнароднай буржуазіяй, якая адчувае сваю пагібель, конкрэтна ставіцца пытаньне аб тэрмінах зьнішчэньня СССР, у гэты момант, калі ўзьнімаецца хваля новай барацьбы, калі прадбачыцца, быць можа, об'ектыўная непазьбежнасьць рашучай схваткі двух сьветаў,—у гэты момант усё тое, што ў нас у СССР можа дапамагаць і аказваць садзейнічаньне варожаму нам сьвету, павінна быць зьмецена і зьнішчана раз назаўсёды.

Дзяржаўнае абвінавачаньне патрабуе ад спэцыяльнага прысутнічаньня Вярхоўнага Суду расстрэлу ўсіх да аднаго.

Заключныя словы тав. Крыленка пакрываюцца бурнымі воплескамі ўсёй залі.

Уся заля ўстае, бурныя аплёдысмэнты пераходзяць у грандыёзную овацыю.

Абвяшчаецца перапынак да 6-й гадзіны вечару.

*) Канец. Пачатак гл. ў № 281 і 282

Прамова абаронцы т. т. Браудэ і Оцэпа

Слова даецца старшынёю суда, тав. Вышынскім, абаронцы Браудэ, які абараняе падсуднага Купрыянава. Згаджаючыся з вывадамі, якія зрабіў тав. Крыленка ў сваёй прамове, абаронца, аднак, лічыць неабходным спрачацца з разьмерамі кары ў адносінах падабароннага Купрыянава.

Свайго падабароннага Купрыянава тав. Браудэ характарызуе, як палітычна недалёкага чалавека, які ў моц сваёй недалёкасьці бязьмежна адданы свайму гаспадару—Канавалаву. Падкрэсьліваючы сялянскае паходжаньне Купрыянава, абаронца імкнецца давесьці, што толькі дзякуючы шчасьліваму злучэньню акалічнасьцяй, дзякуючы выпадковасьці і нячуваным здольнасьцям Купрыяў выбіўся ў інжынэры, і заняў адно з віднейшых мейсц сярод спэцыялістых расійскай тэкстыльнай прамысловасьці. У заключэньне абаронца ўказвае, што далёка ня ўсе тыя, хто павінен быў заняць лаву падсудных і адказваць за дзейнасьць „прампартыі“ і падрыхтоўку да інтэрвэнцыі, за ажыцьцяўленьне пляну контр-рэволюцыйнага шкодніцтва, сапраўды гэтую лаву займаюць. Галоўныя гістарычныя вінавайцы, галоўныя падсудныя, якія складалі галоўны кіруючы цэнтр контррэволюцыйнай дзейнасьці шкоднікаў—Пуанкарэ, Гандальпром і акулы сусьветнай рэакцыі—пакуль што ўніклі пролетарскага суда. Абаронца просіць суд пры вызначэньні кары яго падабароннаму Купрыянаву падыйсьці да яго больш лёгка, як палітычна і моральна раздушанай асобе, якая служыла марыонэткай у руках сапраўдных організатараў контр-рэволюцыйнага нападу на СССР і контррэволюцыйнай барацьбы з Савецкай уладай.

Абаронца падсуднага Сітніна, тав. Оцэп, просіць суд улічыць поўнае адмаўленьне ад учарайшых ідэй, поўнае і шчырае пакаяньне яго падабароннага, якое прагучэла хаўтурным звонам над усёй яго папярэдняй дзейнасьцю. Абаронца напамінае прысуд па справе Саюзу Вызваленьня Украіны, указваючы, што савецкі суд знайшоў рэволюцыйна-мэтазгодным адмовіцца ад прымяненьня да іх вышэйшай меры соцыяльнай абароны і замяніць яе турэмным зьняволеньнем, а таксама—прысуд спэцыяльнай прысутнасьці Вярхоўнага Суда па шахцінскай справе, у якім сам суд знайшоў магчымым узьняць у стасунку нек-торых падсудных, улічваючы іх раскаяньні і магчымасьць скарыстаць іх у далейшым, як кваліфікаваную рабочую сілу на практычнай працы,—хадайніцтва аб замене расстрэлу.

Пераходзячы да характарыстыкі падабароннага Сітніна, тав. Оцэп падкрэсьлівае, што адзін з другарадных пэрсонажаў у гэтай справе—падсудны Сітнін—няпрыкметны, рыхлы чалавек. Сітнін—не галава ў галіннай шкодніцкай організацыі і ня член ЦК. Сваю прамову абаронца заканчвае заклікам да суда захаваць Сітніну жыцьцё і паставіць яго ва ўмовы, якія дазволяць яму сумленнай працай выкупіць сваю найвялікшую віну.

Пасьля прамовы абаронцы т. Оцэпа, тав. Вышынскі прапануе дзяржаўнаму абвінавачаньню абмяняцца рэплікамі з абаронай.

Крыленка:—Дзяржаўнае абвінавачаньне ня бачыць у гэтым патрэбы. Усё ясна...

Пасьля кароткага перапынку тав. Вышынскі абвяшчае аб канчатку спрэчак бакоў. У адказ на прапанову старшыні, падсудныя Рамзін, Ларычаў, Калінькікаў, Фядотаў, Чарноўскі і Ачкін адмаўляюцца ад прамовы ў абарону сябе, указаўшы, што скарыстаюць свае права апошняга слова. Спэцыяльная прысутнасьць Вярхоўнага Суда прыступае да заслухоўваньня апошніх слоў падсудных.

Пролетарыят бязьлітасны да шкоднікаў, шпіёнаў, інтэрвэнтаў

ПРЫГАВОР

ПА СПРАВЕ КОНТРРЭВОЛЮЦЫЙНАЙ ОРГАНІЗАЦЫІ—„ПРАМЫСЛОВАЙ ПАРТЫІ“

(Атрымана па радыё а 1 гадз. ўначы)

7-га сьнежня пасьля 36-ці гадзіннай нарады спэцыяльнага прысутнічаньня Вярхоўнага суду СССР, вынесен прыгавор па справе контррэволюцыйнай організацыі „Прампартыі“.

Прыгаворам спэцыяльнага прысутнічаньня Вярхоўнага Суду прысуджаны: Рамзін, Ларычаў, Чарноўскі, Калінькікаў, Фядотаў да вышэйшай меры соцыяльнай абароны—РАСТРЭЛУ з канфіскацыяй належачай ім усёй маёмасьці.

Падсудныя Купрыянаў, Очкін і Сітнін прысуджаны да 10-ці гадоў пазбаўленьня волі, кожны з суровай ізоляцыяй і конфіскацыяй маемасьці, і паражэньнем у правах тэрмінам на 5 год кожны пасьля адбыцьця кары.

Прыгавор канчатковы, абскарджаньню не падлягае.

Прыгавор быў спаткаваны бурнымі воплескамі перапоўнiўшай залю публікай.

УСІМ ГАРКОМАМ І РАЙКОМАМ КП(б)Б

Для забясьпечаньня металюргічных заводаў мэталяломам праводзіцца па ўсім Саюзе, з 1 па 10 сьнежня, дэкада збору лому. Плян нагатовак па БССР выкананы на 50 проц. ЦК лічыць тэмпы праядзеньня дэкады зусім недапушчальнымі. Не мобілізаваны масы для выкананьня гэтай важнай гаспадарча-палітычнай задачы. Комсамол, які павінен быць ініцыятарам і організатарам дэкады збору мэталалому, не праводзіць гэтую работу па-ўдарнаму.

ЦК КП(б)Б прапануе ГК і РК КП(б)Б:

а) безадкладна праверыць ход збору і здачы мэталалому і асабліва лому каляровых мэталяў;

б) прыняць усе захады да мобілізацыі шырокіх мас рабочых, калгасьнікаў, жанчын, моладзі, вучняў для ўдзелу ў правядзеньні дэкады праз організацыю суботнікаў, збору лому ў аднаасобнікаў і г. д.;

в) аб выніках дэкады паведаміце 15-XII-30 г. Цэнтральны штаб па правядзеньню дэкады пры ЦСПСБ.

Сакратар ЦК КП(б)Б **Шэранговіч.**

„СОЦЫЯЛІЗМ—ГЭТА ПЛЯН“ (ЛЕНІН)

СОТНІ ДЗЯРЖПЛЯНАЎ У ВАРШТАТА—

ВОСЬ НАШ ПАДАРУНАК X-му ЗЬЕЗДУ ЛКСМБ НАШ АДКАЗ ШКОДНІКАМ І ІНТЭРВЭНТАМ

Як мага лепей скарыстаць свае сілы, ніводнага лішняга рабочага, варштату на заводзе, змагацца за плянавае, унутры-заводзкае будаўніцтва—галоўныя задачы опэрацыйна-плянавых груп

ЗАБЯСЬПЕЧЫМ ЗАВОДЫ, ФАБРЫКІ, ЦЭХІ і ВАРШТАТЫ ПЛЯНАВАЙ БЕС-ПЕРАБОЙНАЙ РАБОТАЙ ПА ВЫКАНАНЬНЮ ПЛЯНАЎ 3-га ГОДУ ПЯЦІГОДКІ

Да X зьезду—сотні плянавых груп

Аб правых памылках бюро колектыву Наргасу БДУ

1-га сьнежня г. г. у газэце „Чырвоная Зьмена“ быў зьмешчан артыкул „Душаць творчую ініцыятыву“. У гэты-ж дзень адбылося паседжаньне бюро колектыву сумесна з актывам, скліканае для абгаварэньня зьмешчаных у газэце матар'ялаў.

Пытаньне плянаваньня нашага ўнутрызаводзкага будаўніцтва на сёньняшні дзень адыгрывае асаблівую ролю. Комсамольцы ленінградзкага „Чырвонага Пуцілаўца“ першымі ўзяліся за гэтую працу і дабіліся вялікіх посьпехаў.

Вельмі часта нашыя заводы і фабрыкі няплянава будуюць сваю працу. У час, калі ўся наша краіна на расьце на агульнаму вялікаму пяцігадоваму пляну ў паасобных мясцох вельмі часта перагружаныя прадпрыемствы выконваюць зусім няспешныя заказы, будуюцца нерацыянальна, устанаўліваюцца непатрэбныя ў гэты момант машыны і потым гэта абсталяваньне ідзе на звалку. Досыць адзначыць, што толькі за апошнія дні комсамольцы Бабруйскага дрэваапрацоўчага комбінату выявілі дзесяткі каштоўных машын і частак для іх, якія на комбінаце не скарыстоўваюцца і не будуць скарыстаны.

Такіх прыкладаў багата. Зараз наша краіна стаіць на парозе трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Трэці год будзе годам яшчэ больш шпаркага соцыялістычнага будаўніцтва. За гэты год будуць пабудаваны новыя гіганты соцыялістычнай індустрыі, будуць пашыраны старыя заводы.

Мы зьяўляемся сьведкамі выкрытых за апошні час шкодніцкіх груп, сьведкамі шкодніцтва ў вышэйшых органах плянаваньня — у Дзяржпляне.

Усё гэта ставіць пытаньне аб больш актыўным удзеле ўсіх рабочых ва ўнутрызаводзкім плянаваньні, аб стварэньні плянава-опэрацыйных груп пры кожным заводзе і фабрыцы, пры кожным цэху і варштаце.

Плянава-статыстычнае аддзяленьне факультэту народнай гаспадаркі БДУ высунула думку аб арганізацыі гэтых плянава-опэрацыйных груп на двух падшэфных факультэту заводах — „Бальшавік“ і „Полымя Рэволюцыі“.

Абгаварылі, напісалі ліст у газэту „Чырвоная Зьмена“ і прыступілі да працы. На заводы пасылаюцца брыгады і пачынаюць разгортваць працу.

24 лістапада на паседжаньні бюро колектыву ставіць інформацыю сакратара стат.-плянавай групы і выносіць пастанову: „Вылучыць кіруючую брыгаду, высьветліць становішча, склікаць нараду соцыялістаў, а пакуль што працу спыніць“.

Гэта было 24. І толькі 1-га, калі зьявіўся артыкул „Душаць творчую ініцыятыву“, гаварылі аб сваёй рабоце.

Паседжаньне скончылася а 3-ай гадзіне ўночы. Пяць гадзін цягнулася паседжаньне. Тут выкрыўся твар некаторых кіраўнікоў, якія, вітаючы ініцыятыву, фармальна за яе галасуючы, на самай справе імкнуліся яе задушыць не падтрымалі яе і сваімі маруднымі, непаваротнымі тэмпамі хацелі загнаць яе ў гроб.

Бурным быў гэты сход. Пачалося з таго, што як сакратар колектыву Вайнэр, так і астатнія члены бюро не хацелі прызнаць свае памылкі, сваю блізарукасьць і опортуністычную практыку. Яны не жадалі прызнаць, што вынікам іхняй працы зьявілася спыненьне работы плянава-опэрацыйных груп на заводах. І толькі пасьля доўгіх спрэчак, калі лічбы і факты прымусілі іх прызнацца ў сваёй памылцы, яны часткова прызналіся. Зараз перад намі—пастанова агульнага сходу колектыву ЛКСМБ Наргасу БДУ аб допушчаных памылках у справе організацыі плянава-опэрацыйных груп і адказ на допіс, надрукаваны ў газэце „Чырвоная Зьмена“ ад 1-га сьнежня 1930 г.

Заслухаўшы інформацыю сакратара колектыву ЛКСМБ Наргасу, тав. Вайнэра, аб допушчаных памылках у пастановах бюро колектыву ад 23-га лістапада і 1-га сьнежня і ў пастанове бюро парт. колектыву ад 3-га сьнежня г. г., колектыў ЛКСМБ адзначае:

... бюро колектыву ЛКСМБ Наргасу сваімі пастановамі допусьціла грубыя політычныя памылкі.

1. У сваёй пастанове ад 23-га лістапада бюро не дало адпаведнай політычнай ацэнкі мерапрыемству, якое было высунута ячэйкай КСМ плян статыстычнага аддзяленьня аб организацыі плянава-опэрацыйных брыгад на прадпрыемствах, не падхапіла гэтую ініцыятыву для ўсямернага перанясеньня на ўсе зьвеньні сваёй працы і не аказала належнай дапамогі плянстатаўскай ячэйцы ў разгортваньні ўжо распачатай працы на заводах „Полымя Рэволюцыі“ і „Бальшавік“, у зьвязку з чым пастанова зьявілася да опортуністычнай недаацэнкі політычна-важных пачынаньняў па сапраўднай сувязі паміж студэнцтвам і вытворчасьцю.

2. Заметка ў газэце „Чырвоная Зьмена“ сваечасова і правільна сыгналізавала аб тым, што бюро комсамольскага колектыву Наргасу БДУ недаацэніла політычнай важнасьці і значэньня гэтай работы, што прывяло да зрыву ўсёй пачатай работы ў гэтым напрамку. Бюро колектыву не намеціла далейшых конкрэтных мерапрыемстваў гэтай работы, за выключэньнем таго, што склікала нараду і вынесла пастанову аб вылучаньні брыгады па кіраўніцтву гэтай працай, бюро не дало ўказаньня іншым ячэйкам аб тэрміновым разгортваньні гэтай працы, што об'ектыўна зьявілася зацiскам творчай ініцыятывы.

3. Бюро колектыву прызнаючы ў сваёй пастанове ад 1-га сьнежня сваечасовасьць заметкі ў газэце „Чырвоная Зьмена“, наўмысьль павольнасьці з боку бюро ячэйкі, не дало адпаведнай ацэнкі сваім памылкам.

4. Ячэйка ЛКСМБ плянстатаўскага аддзяленьня здолела мобілізаваць на гэтую справу беспартыйнае студэнцтва, распачаць працу на заводзе „Полымя Рэволюцыі“ але, дзякуючы пастанове бюро, прымушана была спыніць далейшую працу, чым выклікала нездавальненьне з боку рабочых.

Агульны сход колектыву са здавальненьнем адзначае факт поўнага прызнаньня з боку бюро і колектыву сваіх памылак і выпраўленьня іх на конкрэтнай рабоце, якую бюро колектыву разгарнула па организацыі плянава-опэрацыйных груп на падставе рашэньняў бюро партыйнага колектыву!

Такім чынам, бюро было прымушана прызнаць свае памылкі і прыступіць да выпраўленьня іх.

Сёньня мы зьмяшчаем пастанову бюро колектыву. У гэтай пастанове намячаецца шэраг конкрэтных захадаў да разгортваньня гэтай працы.



Словы і справы

Ячэйка плянстату разгарнула працу па опэрацыйна - плянавых групах у парадку падрыхтоўкі да X зьезду ЛКСМБ і IX зьезду УсеЛКСМ. Лепшым падарункам да будучых зьездаў будзе правільная расстаноўка сіл на вытворчасьці, барацьба за кожнага рабочага, кожную машыну і плян.

Зараз перад усёй організацыяй паўстае баявая задача—пакрыць густой сеткай плянава-опэрацыйных груп усе фабрыкі і заводы. На сумных вузках начулася і закаранелацьці, допушчаных з боку бюро колектыву Наргасу, неабходна вучыцца як ня трэба працаваць і як трэба, выпраўляючы допушчаныя памылкі, разгортваць працу на ўсіх прадпрыемствах, выяўляючы ўсе перашкоды на вытворчасьці лішнія запасы рабочае сілы, дапамагаючы рацыяналізатарам і памагаючы бюро ў справе плянаваньня ўнутры-заводзкага будаўніцтва.

Ініцыятыва ячэйкі плянстату падхоплена. Зараз яе павінны падхапіць **усе ячэйкі комсамолу ўсіх фабрык і заводаў, саўгасаў і колгасаў з тым, каб да X зьезду комсамолу, да пачатку 3-га ўдарнага году пяцігодкі, прыйсьці з сотнямі плянава-статыстычных груп.**

Сотні дзяржплянаў у варштата вось наш падарунак X зьезду ЛКСМБ, наш адказ шкоднікам-інтэрвэнтам.

Л. Глазэр.

Плянава-опэрацыйнымі групамі штурмаваць прарывы

Выклік прымаем

Абгаварыўшы ліст комсамольскай ячэйкі плянстату Наргасу БДУ аб стварэньні плянава - опэрацыйных брыгад на заводах, бюро ячэйкі ЛКСМБ прамысловага аддзяленьня факультэту НГ БДУ адзначае; пачын з боку плянстату ячэйкі ЛКСМ зьяўляецца лепшым падарункам IX зьезду УсеЛКСМБ і X—ЛКСМБ.

Ячэйка ЛКСМБ прамысловага аддзяленьня прымае выклік плянстатаўскай ячэйкі. Надаючы гэтаму пачыну вялізарнейшае значэньне, бюро ячэйкі ўхваліла правесьці наступнае:

Мобілізаваць увагу комсамольцаў і ўсяго студэнцтва аддзяленьня па пытаньню стварэньня плянава-апэрацыйных брыгад. Папоўніць брыгады, якія ўжо працуюць на зав. „Энэргія“, „Бальшавік“, „Полымя Рэволюцыі“ выстарчальнай колькасьцю комсамольцаў, адначасова стварыць новыя брыгады і паслаць на заводы „Комунар“, швэйную фабрыку „Акцябрь“, пашыраючы вопыт на астатніх прадпрыемствах гор. Менску.

Скласьці брыгады з комсамольцаў і студэнцтва 5 курсу прам. аддз., якія аб'ядноўць практыку на ўсіх заводах Беларусі, якім умявіць у абавязак распачаць працу па организацыі брыгад на тым прадпрыемстве, дзе яны будуць практыкавацца.

Па меры неабходнасьці склікаць нарады кіраўнікоў брыгад на прадпрыемстве, куды запрашаць вытворчых працаўнікоў для консультацыі на паасобных пытаньнях.

У аснову сваёй працы брыгады павінны пакласьці:

1. Вывучэньне і плянаваньне творчага процэсу ў цэху і на прадпрыемстве. Адначасова заняцца пытаньнем высьвятленьня лішняй рабсілы на прадпрыемствах.

2. а аснове агульнага прамфінпляну скласьці цэхавы плян і весьці яго да кожнага станка і рабочага.

3. Вывучэньне магутнасьці кожнага цэху на аснове паспартызацыі ўсяго цэху, складаньне на грунце гэтых норм выпрацоўкі і сустрэчных промфінплянаў для кожнага станка.

4. Вывучыць прычыны страт і браку ў цэху, заняцца зьнішчэньнем тых прычын, якія прыводзяць да страт і браку.

5. Вывучыць разыходжаньне між паасобнымі цэхамі на прадпрыемстве. Дабіцца забясьпечаньня цэхаў сыравінаю, каб ня зрывалася плянавая праца.

6. Сачыць за безадкладным і сваечасовым выкананьнем рабочых прапаноў.

Бюро яч. ЛКСМБ прамысловага аддз. фак. НГ БДУ.

У кожны цэх—дзяржплян

З пастановы бюро колектыву ЛКСМБ Наргасу па пытаньню аб організацыі і працы плянава-опэрацыйных брыгад ад 4-XII—30 г.

1. Абгаварыўшы пытаньне аб організацыі працы плянава-опэрацыйных брыгад, бюро адзначае вялікае політычнае значэньне справы плянава-опэрацыйных брыгад.

2. Бюро лічыць, што ў аснову працы плянава-апэрац. груп павінна легчы:

1) Сачыць за суадпаведнасьцю паміж вытворчасьцю цэхаў міжсобку, паасобных варштатаў у сэнсе сваечасовага забясьпечаньня цэхаў і варштатаў сыравінай і паўфабрыкатамі;

2) Барацьба са стратамі;

3) Выяўленьне недахопаў у вытворчым процэсе і неадкладнае іх зьнішчэньне;

4) Барацьба за якасныя паказчыкі (паменшаньне браку і сабекошту);

5) Сачыць за правільным выкарыстаньнем варштатаў;

6) Прыстасаваньне і правядзеньне ў жыцьцё рабочых прапаноў;

7) Вывучэньне прапускной здольнасьці варштатаў і цэхаў.

Усю гэту работу праводзіць на аснове цэхавых плянаў і калькуляцыйных дадзеных.

3. Надаючы вельмі важнае значэньне проблеме забясьпечаньня рамі народнай гаспадаркі, лічыць абходным падняць барацьбу за выяўленьне лішняй рабочай сілы на прадпрыемствах і магчымасьці эканоміі ў рабочай сіле, для чаго ўскласьці на комсамольцаў, якія будуць організоўваць і працаваць у брыгадах, абавязак паставіць гэтую задачу ў праграму сваёй працы, як баявую.

4. Групы павінны складацца з рабочых, якія непасрэдна працуюць на вытворчасьці, з прымацаваньнем дапамогі студэнтаў.

5. Брыгады павінны быць організаваны ў першую чаргу на кожным заводзе і ў цэху кожнага заводу, куды ад'яжджаюць комсамольцы-практыканты.

6. Працу плян.-опэрац. брыгад асьвятляць у „Ч. Зьмене“ і насьценных газэтах прадпрыемства.

Бюро колективу ЛКСМБ Наргасу БДУ.

Усім райкомам ЛКСМБ

Пошта-тэлеграма

Нарыхтоўкі ільна, пянькі, валакна і насеньня праходзяць недапушчальна марудным тэмпамі. Прычыны слабасьці правядзеньня нарыхтовак—у адсутнасьці належнай організацыйнай масавай растлумачальнай працы сярод бядняцка-серадняцкіх мас сялянства. Адсутнічае адпаведны націск на кулацка-заможную вярхушку вёскі па даводу к тэрміну цьвёрдага заданьня, а ў паасобных мясцох заданьні не даведзены нават да гэтых двароў. Гэткае становішча патрабуе найбольш актыўнага ўдзелу комсамольскай організацыі у нарыхтоўках. ЦК ЛКСМБ прапануе безадкладна зрабіць рашучы пералом у рабоце комсамольскіх організацый па выкананьню плянаў ільна-пянькі нарыхтовак. Мобілізаваць актыў і выслаць брыгады. Прыняць усе захады ў даведзеньні цьвёрдых заданьняў да кулацка-заможных гаспадарак з тым, каб яны здалі свае заданьні к тэрміну. Разгарнуць баявую работу ў правядзеньні 10-дзённіку.

Сакратар ЦК ЛКСМБ—ПАЛЯКОЎ.
Заг. С-Г. Сэктару—РУДНІЦКІ.

НЕПАХІСНА ЗМАГАЦЦА ЗА ГЕГЕМОНІЮ ПРОЛЕТАРСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Да канца выкрываць і выкарчоўваць нацыянал-дэмократычную ідэолёгію ў літаратуры, рашуча змагацца з вялікадзяржаўным расійскім шовінізмам, які ўяўляе галоўную небясьпеку. разьбіваць шовіністычныя плыні іншых колераў

„Той, хто сягоньня сьпявае ня з намі—той супраць нас!“ *(Ул. МАЯКОЎСКІ)*

Няма літасьці агэнтам польскай ахранкі— беларускім нацыянал-дэмократам

Агульны сход савецкіх беларускіх пісьменьнікаў з абурэньнем ганьбіць подлую, падрыўную дзейнасьць былых „незалежных“ беларускіх міністраў, контр-рэволюцыйных афіцэраў, чорнасоценных царскіх чыноўнікаў і буржуазных і дробна-буржуазных беларускіх нацыяналістых.

Усё гэтае лахмоцьце пануючых у мінулым кляс, ідэолёгі сучаснага кулацтва і дробнае буржуазіі, служкі і лёкаі сусьветнага імпэрыялізму, родныя браты польскага і беларускага фашызму рыхтавалі, разам з сваімі гаспадарамі, крывавую лазьню для рабочых і сялян Савецкай Беларусі, рыхтавалі новае ярмо, каб накінуць яго на шыю працоўным, пасьля крывавага разгрому соцыялістычных рэспублік.

Гэтая зграя груганоў добра вядома рабочым і сялянам, а таксама тэй частцы інтэлігенцыі, якая сапраўды разам пашла з пролетарыятам. Яшчэ не зьніклі з памяці жахлівыя месяцы, калі беларускія міністры і фашысцкія бандыты і ўсялякі бруд разам з сваімі гаспадарамі-нямецкімі і польскімі окупантамі—катавалі сапраўдных сыноў Беларусі, тых, якія не хацелі ліць свой пот на карысьць паноў капіталістых і лёкаяў нацыянал-дэмократаў.

Сваёй конт-рэволюцыйнай дзейнасьцю на розных вучастках соцыялістычнага будаўніцтва яны рыхтавалі нявольле, зьдзекі для рабочых і сялян Беларусі. Апранаючы на сябе маску прадстаўнікоў беларускай нацыі, гэтая зграя хавала свой сапраўдны агідны твар. Як у часы дарэволюцыйныя гэтыя груганы не зьяўляліся прадстаўнікамі беларускага народу, г. зн. рабочых і сялян, так і з першых дзён Кастрычнікавай рэволюцыі яны актыўна павялі барацьбу супроць рабочых і сялян, якія сваёю крывёю заваёўвалі сабе волю і ўмовы для соцыялістычнага будаўніцтва.

Носячы вопратку прадстаўнікоў беларускага народу, змагаючыся супроць рабочых і сялян, яны, міністры і чыноўнікі, агулам і ў разброд гандлявалі беларускімі працоўнымі, прадаючы і кайзэрам, і Пуанкарэ, і Дзянікіну англьскаму імпэрыялізму, цалуючы боты і край жупана „ў Пілсудзкага ў пана“ гэтага „выратавацеля“ яго „роднай зямелькі Беларусі“ ад „барбарскай азыяцкай культуры“—бальшавізму, зазывалі крывавага рыцара, як гаспадарства божы дар, пад беларускі „сьцяг“.

Калі-ж рабочая кляса, разам з біднейшым сялянствам, пад непахісным кіраўніцтвам комуністычнай партыі, вызваліла частку Беларусі ад окупантаў, і штодзённа замацоўваючымся саюзам з серадняцкім сялянствам разгарнула гэроічную працу па загойваньню ран краіны, нанесеных окупантамі і іх лёкаямі — беларускімі ўрадоўцамі, калі ўтварыліся ўмовы для пасьпяховага соцыялістычнага будаўніцтва — ворагі рабочых і сялян Беларусі вярнуліся на тэрыторыю Савецкай Беларусі, ашукаўшы рабочых і сялян, каб працягваць сваю агідную контррэволюцыйную дзейнасьць на гэты раз у новых формах, шляхам шкодніцтва на гаспадарчым і культурным фронтах, а разам з тым падрыхтоўкі інтэрвэнцыі сусьветнага імпэрыялізму.

Выкарыстаўшы давер'е рабочых і сялян, контррэролюцыйная група, пры дапамозе нацыянал-опортуністых, захоплівала кіраўніцтва асобнымі вучасткамі гаспадарчага і культурнага фронту (НКЗ, НКА, катэдры БАН, БДУ, БДВ), праводзячы там сваю контр-рэвол. нацыянал-дэмократычную работу, перашкаджаючы соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, ліквідацыі кулацтва як клясы на гэтай аснове і росту пролетарскіх кадраў.

Асаблівую ўвагу контррэволюцыйны нацыянал-дэмократызм аддаваў літаратурнаму фронту. Маючы сваіх агэнтаў у літаратурных організацыях, контррэволюцыя рабіла ўсё магчымае, каб абярнуць літаратуру супроць соцыялістычнага будаўніцтва. У гэтай справе контррэволюцыя мела некаторыя посьпехі, уплываючы на няўстойлівае, дробнабуржуазнае крыло літаратуры. Асабліва гэты ўплыў сказаўся ў літаратурных аб'яднаньнях „Полымя“ і „Узвышша“. Сход адзначае, што з усіх літаратурных організацый на Беларусі найбольш ваяўніча, найбольш пасьлядоўна праводзіла барацьбу супроць нацыянал-дэмократызму ў літаратуры БелАПП, ня гледзячы на наяўнасьць у сваіх шэрагах адзінак нацыянал-дэмократаў і адзінак, што хісталіся.

Ганьбуючы здрадніцкую, контр-рэволюцыйную інтэрвэнцкую дзейнасьць нацыянал-дэмократаў сход заклікае ўсю савецкую інтэлігенцыю, усіх тых, каму дорага і родна справа соцыялістычнага будаўніцтва шчыльней злучыць свае рады навакол пераможцы-пролетарыяту, пад разгорнутыя сьцягі комуністычнай партыі.

Сход патрабуе суровага пакараньня тых, хто на крывавых штыхох інтэрвэнтаў нёс няволю працоўным нашай краіны.

Няхай жыве соцыялістычнае будаўніцтва!

Няхай жыве комуністычная партыя — кіраўнік соцыялістычнага будаўніцтва!

Няхай жыве верны, надзейны вартаўнік заваёў Кастрычніка—АДПУ!



Каб нас
праз турмы і растрэл
прадаць
з аукцыёну—
пачаў
Вайна—Пуанкарэ
расійскіх
збор пагонаў.

Гатуюць у строй гарматы
былыя ўладары—
па фабрыкі, па нафту.
Па золата ў Парыж.

Імкнецца кулі сеяць
палкоўніцкі парад:
„за матушку Расею,
за белага цара“.

Калі-ж прарэжа
даль
сыгнал
ад бальшавіцкай
вахты:
— Не ў пяршыню
пакінуць нам
палі,
заводы,
шахты.

І прымуць нас акопы
і нас і наш набой,
каб новым Перакопам
ім даць апошні бой..

Каб курганамі сталі,
хто нашай сьмерці рад—
ад горнага Уралу
да беларускіх хат.

Каб дзень і ноч
ты быў гатоў,
ты сілы
на АСО
кінь.

На поўны ход
пускай матор
па рэйках
пяцігодкі.

Энэргію патроіць!
Сягоньня: хто-каго!
Звышплянавай рудою
па ворагу—агонь!

Угрунь пускай машыну
на бальшавіцкі старт.
Ударнаю гадзінай
па ворагу ўдар!

г. Добруш, лістапад 1930 г.

Пільней сачыць за ворагамі пролетарскай дыктатуры

Цэнтральная Рабочая Літаратурная Студыя БелАППу, цалкам далучаецца да протэсту Сэкратарыяту БелАПП'у і агульнага сходу Менскай філіі БелАПП'у, вынесенага супроць контррэволюцыйнай беларускай нацыяналдэмократычнай групы.

Цэнтральная Рабочая Літаратурная Студыя БелАПП'у на нацыянал-дэмократычныя контррэволюцыйныя спробы задушыць выспу сусьветнага Кастрычніка—СССР адказвае:

Яшчэ большай напружанасьцю выконваць задачы комуністычнае партыі па ўмацаваньню пролетарскіх літаратурных кадраў.

Крокам у крок з волатамі соцыялістычнага будаўніцтва, шпаркімі тэмпаміісьці ў сваёй літаратурнай творчасьці, адлюстроўваючы ўсе процэсы соцыялістычнага будаўніцтва ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы;

Пільней сачыць за ворагамі пролетарскай дыктатуры, зрываючы маскі на кожным кроку іх дзеяньня;

Уся ўвага пролетарскаму маладняку! Штодзённай работай, штодзённымі клапотамі, штодзённай вучобай дамо пролетарскай літаратуры пролетарскіх ударнікаў, сталёва-ідэёвых барацьбітоў за соцыялізм;

Мы толькі з пролетарыятам, органічна з ім зьвязаныя ў творчых процэсах, у штодзённай рабоце, будзем праводзіць сваю літаратурную творчую работу;

Мы за выхаваньне працоўнага маладняка ў напрамку клясавай нянавісьці, клясавой непрымірымасьці да ворагаў пролетарскай дзяржавы.

Задачы партыі—нашы задачы.

Гіганцкія тэмпы соцыялістычнага будаўніцтва—нашы тэмпы!

Бой з клясавым ворагам — наш бой!

Бранёвай сьцяною за будаўніцтва соцыялістычнай гаспадаркі, супроць падпальшчыкаў новае вайны, супроць нацыяналдэмократычных падлізьнікаў сусьветнага капіталізму.

За інтэрнацыянальную солідарнасьць працоўных усяго сьвету.

За інтэрнацыянальную пролетарскую літаратуру ўсяго сьвету.

Замест клясава-варожай трухлядзі дамо пролетарскай краіне, пролетарскай літаратуры сотні новых пролетарскіх літаратурных змагароў—ударнікаў фабрык, заводаў, саўгасаў і колгасаў.

Мы патрабуем ад пролетарскай дыктатуры для контррэволюцыянэраў нацдэмократаў суровае расправы.

Няхай жыве Комуністычная партыя—верны кіраўнік пролетарскай дыктатуры!

Няхай жыве верны абаронца кастрычнікавых заваёў—АДПУ!

Няхай жыве пролетарская літаратура—змагар за соцыялістычную бацькаўшчыну СССР, за інтэрнацыянальную солідарнасьць працоўных усяго сьвету!

М. Процька, А. Сячко, Я. Зазека, М Вісажар, Ю. Бітус, Т. Алесін, А. Сокал. У. Гуцько, З. Бульбянік.

„Патрабую самых суровых мер для прыхвасьняў польскага фашызму“

З нячуванымі тэмпамі і такімі-ж нячуванымі посьпехамі будуецца соцыялізм у Савецкім Саюзе, выклікаючы шалёную нянавісьць да рабочых і працоўных сялян з боку іх клясавых ворагаў—сусьветнае буржуазіі, сусьветнае контр-рэволюцыі. Кожны крок пролетарскае рэволюцыі набліжае немінучую пагібель усіх тых, хто жыў і хто жыве чужою працай, хто эксплёатуе мільённыя масы працоўных, хто свой дабрабыт будуе на катаваньні, уціску, прыгнечаньні тых, якія, абліваючыся крывёю і потам у непасільнай працы, ніякіх здабыткаў ня маюць на зямлі, акрамя свае ўласнае пары рук.

Сусьветная контр-рэволюцыя адчувае сваю немінучую пагібель і вострыць меч супроць дыктатуры пролетарыяту, супроць пролетарскае рэволюцыі якой мы абавязаны стварэньнем адзінай у сьвеце пролетарскай дзяржавы—СССР, рэволюцыі, якой мы абавязаны заснаваньнем, ростам і пасьпяховым развіцьцём і нашае Беларускае Савецкае Соцыялістычнае Рэспублікі. Толькі ў цесным яднаньні з працоўнымі ўсяго Савецкага Саюзу пры іх брацкім патрыманьні і дапамозе Савецкая Беларусь змагла дасягнуць вялізарных посьпехаў у разьвіцьці як сваей экономікі, так і культуры.

Гэтыя посьпехі, як і посьпехі працоўных усяго Саюзу, хвалююць нашых ворагаў як за межамі, так і ўнутры нашай краіны. Яны рыхтуюць супроць нас вайну, яны рыхтуюць супроць нас шыбеніцы і кулямёты, рыхтуюць крывавую інтэрвэнцыю.

Сусьветная контр-рэволюцыя вострыць меч супроць нас.

Сусьветнай контр-рэволюцыі дапамагала і контр-рэволюцыйная група беларускіх нацыянал-дэмократаў, якая, зьвязаўшыся з авангардам сусьветнага капіталізму—польскім фашызмам, вяла ўнутры БССР падрыхтоўку да гэтай інтэрвэнцыі, актыўна ёй дапамагаючы.

Контр-рэволюцыйныя дзеяньні беларускіх нацыянал-дэмократаў, уся іх програма, маюць адным з сваіх вытокаў буржуазны беларускі нацыянальны рух часоў „Нашае Нівы“.

Што прадстаўляе сабою загорнутая „шчырымі беларусамі“ ў мантыю „рэволюцыйнасьці“ „Наша Ніва“?

Вось некаторыя факты, вядомыя мне з пэрыоду „Нашае Нівы“ 1912-1915 гадоў а) на газэту і на друкаваньне беларускіх кніжак давалі сродкі розныя панкі і шляхцічы, княгіня Радзівіл, уніяцкі мітрапаліт Шаптыцкі і іншыя; б) галоўным яе ідэолёгічным кіраўніком быў цяперашні фашысты Антон Луцкевіч; в) „Наша Ніва“ мела каля 600-700 платных і дармовых падпісчыкаў, вялікую большасьць якіх складалі ксяндзы, паны, панкі, чыноўнікі, кулакі і студэнты—дзеці кулакоў і чыноўнікаў,—усе тыя, хто зьбіраў у адзін гурт „увесь беларускі народ“. Працоўныя сялянскія масы ня ведалі „Нашай Нівы“, аб рабочых і гаварыць ня прыходзіцца.

Часы нямецкай і белапольскай окупацыі Беларусі зьяўляюцца паступовым крокам нашаніўскіх так званых „шчырых беларусаў“ у „зьбіраньні беларускага народу ў адно цэлае“—бяз клясавай розьніцы, у буржуазную беларускую рэспубліку, сілы якой накіроўваюцца на змаганьне з дыктатурай пролетарыяту. Гэта дзейнасьць сваёй контррэволюцыйнасьцю вядома ўсім рабочым і працоўнаму сялянству БССР.

У гэтым месцы мушу сказаць і аб сабе. Знаходзячыся ў акружэньні і пад уплывам беларускіх нацыянал-дэмократаў у часы окупацыі, а таксама і раней, у часе маёй працы ў „Нашай Ніве“, я маёй публіцыстыкай і некаторымі літаратурнымі творамі ў беларускіх пэрыодычных выданьнях таго часу сьпяваў у іх дудку, быў свайго роду труба дурам нацыянал-дэмократычнага руху. Лічу маю працу таго часу чорным цэнем у сваім жыцьці.

Так, я лічу, што ў літаратурнай організацыі „Узвышша“ я ня вёў рашучага змаганьня са спадчынай нацыянал-дэмократызму, лічу, што мною дапушчаны былі памылкі і ў часе майго рэдагаваньня часопісу „Наш Край“, куды траплялі часта нацыянал-дэмократычныя па ўстаноўцы матар'ялы, нацыянал-дэмократычныя думкі, тэндэнцыі.

Але соцыялістычнае будаўніцтва, гэроічнае змаганьне пролетарыяту за лепшыя ідэі чалавецтва — комунізм, правільнае вырашэньне комуністычнай партыяй нацыянальнага пытаньня — накіравалі маю літаратурную творчасьць на здаровы шлях. Я, былы нашанівец, за апошнія гады паступова перавыхоўваўся ў кірунку няўхільнага набліжэньня да задач пролетарскае рэволюцыі, усьведамленьня задач соцыялістычнага будаўніцтва краіны, паставіў перад сабой задачу беспаваротнай адданай працы на карысьць краіны Саветаў. Рашуча адмяжоўваючыся ад контр-рэволюцыйных беларускіх нац.-дэмократаў, як ад іх дзеяньняў, так і ад іх тэорыі, ад іх програмы, якая ставіла курс на стварэньне буржуазна-дэмократычнай рэспублікі, на сёньняшні дзень буржуазна-фашысцкай Беларусі,—я адношуся да гэтай фашысцкай організацыі з непрымірымай нянавісьцю і патрабую самай суровай кары нацыянал-дэмократычным контр-рэволюцыянэрам.

Ня гледзячы ні на якое шкодніцтва ворагаў пролетарыяту, як за межамі СССР, таксама і ўнутры краіны, пасьпяховае соцыялістычнае будаўніцтва пойдзе наперад шпаркім пераможным крокам.

Няхай жыве Комуністычная партыя—кіраўнік соцыялістычнага будаўніцтва!

Няхай жыве перамога пролетарыяту над сваімі ворагамі ва ўсім сьвеце!

Няхай жыве Савецкая Беларусь—непарушная частка ўсяго Савецкага Саюзу!

30-XI—30 г. З. БЯДУЛЯ.



Я малады!
Хачу п'янець прасторам
І араматы траўня
Раскошна удыхаць!
Хачу лунаць арлом
Над полем і над борам!
Хачу кахаць!
Прастору!
Волі мне!
Гэй,—месца для разгону!
Я болей не магу
Гібець ў вастрожным сьне!
Тыраны!
Бойцеся бунтарнага праклёну:
Ён ўсю зямлю ускалыхне!
Навокал ціш... Зьвініць ланцуг
панура...
Гарачым тварам я да крат прынік...
Таёмна скрозь... А тамака за мурам
Гручаць шагі—то ходзіць вартаўнік...
Горадня—Вастрог
30-1-30 г.



Новыя сьцежкі да шчасьця
пралеглі...
Мы—оптымісты! Жыцьця нам ня
страх:
Камень за камнем, цэгла за цэглай
Новы, сусьветны узносім мы гмах.
Рвуцца, нясуцца бунтарскія клічы...
Тамака—ўдалі—ірдзіцца маяк...
— Гэй. натуж сілы, тварэц-
будаўнічы:
Буйны, нястрыманы бой-маладняк.
Цэмантам, стальлю часьцінкі злучаем,
Шпарка магутныя сьцены растуць.
Чорныя сілы замерлі ў адчаі—
Ходу гісторыі ім не вярнуць!
Камень за камнем, цэгла за цэглай,
Сьмела сусьветны узносім мы гмах!
Новыя лёзунгі токам прабеглі...
Гэй, хто стрымае наш творчы
размах?!
Горадня—Вастрог
Студзень 1930 г.

ЗАЙДЗЕЦЕ Ў СЬВІНАГАДОЎЧЫЯ ГАСПАДАРКІ—

ВЫ ЎБАЧЫЦЕ ЗРЫЎ БУДАЎНІЦТВА І ЗЬДЗЕКІ НАД СЬВІНЬНЯМІ

Белколгасбуд сарваў пляны будаўніцтва. Райвыканкомы, сельсаветы ня выконваюць дырэктыў урад

З імпортнымі сьвінаматкамі абыходзяцца па-барбарску

ПАРТЯЧЭЙКІ, КОМСАМОЛ—ШЭФ СЬВІНАГАДОЎЛІ--ВЫ АБАВЯЗАНЫ ЗЛАМАЦЬ ПЕРАШКОДЫ НА ШЛЯХУ РАЗЬВІЦЬЦЯ СЬВІНАГАДОЎЛІ

Рашуча змагацца з сабатажам тэхнікаў

Белколгасбуд выконвае пляны будаўніцтва сьвінарнікаў надзвычайна марудным тэмпам. Програма летняга і асеньняга будаўніцтва выканана: па будаўніцтву матачнікаў на 46,6 проц., месц для халастых сьвіней—14,6 проц., пабудова адкормачнікаў—на 12,2 проц., ізолятараў—на 2 проц.

Прарывы ў выкананьні плянаў бадаўніцтва ў асноўным крыюцца ў тым, што з боку Белкалгасбуду ня было належнага кіраўніцтва і кантролю за ходам будаўніцтва. Кіраўнікі пабудоў, адгаварваючыся рознымі об'ектыўнымі прычынамі, недахоцам рабочай сілы, тэхнічных кадраў і інш., ня прымалі энэргічных мер. Разам з гэтым нельга не адзначыць, што кіраўнікі саўгасаў, колгасаў, райвыканкомаў і сельсаветаў не зьвярталі патрэбнай увагі на будаўніцтва і не дапамагалі яму. На саўгасах і колгасах часта з-за несваечасовай дастаўкі лесаматар'ялаў рабочая сіла ня была забясьпечана работай (колгас „Сталіна", „Вызваленьне" і інш.).

Асабліва дрэнна на будаўніцтве з тэхнічнымі кадрамі, якія займаюцца лятунствам і дэзэртырствам, не жадаюцьісьці на працу па будаўніцтву сьвінарнікаў.

Каб пацьвердзіць гэта, прывядзем некалькі прыкладаў.

Наркомпрацы 20-га кастрычніка зрабіў распараджэньне Радыё-цэнтру аб аслабаненьні тэхніка па с-г. будаўніцтву Буранкевіча, які на Радыё-цэнтры займаецца культурна-асьветнай працай, для скарыстаньня яго па непасрэднай яго спэцыяльнасьці, а Буранкевіч і да гэтага часу не зьявіўся на працу ў колгасбуд.

Тэхнік Палкаў зараз працуе ў Сампрамсаюзе на Аршаншчыне. Нягледзячы на неаднаразовыя распараджэньні Наркампрацы зьявіцца ў распараджэньне Белкалгасбуду, Палкаў туды не зьявіўся.

Дэмобілізаваныя тэхнікі, камандзіры запасу—Якімовіч і Фалін—лічацца на вучоце Менскай біржы працы. Ня гледзячы на ўсе катэгорычныя запатрабаваньні Наркампрацы зьявіцца ў распараджэньне Колгасбуду, яны дэзэртыруюць.

Тэхнік Залін скончыўшы тэхнікум працаваў у проэктным бюро Белколгасбуду, але ў зьвязку з недахопам тэхнічных сіл на будаўніцтве быў накіраван на пэрыфэрыю. Адтуль Залін самаўласна ўцёк. Не зьявіўшыся ў Колгасбуд, ён зараз працуе ў проэктным бюро Дзяржбуду.

Яшчэ большай ганьбы заслугоўвае справа тэхніка комсамольца Ігнатовіча. Працуючы ў проэктным бюро Белколгасбуду, ён сыстэматычна позьніцца на працу, а будучы накіраваны ў Пухавіцкі раён для работы па будаўніцтву сьвінарнікаў, адмовіўся выканаць гэтае распараджэньне дырэкцыі і да апошняга часу працягвае сабатаваць, не зьяўляецца на працу. Ігнатовіч за гэта атрымаў ад дырэкцыі вымову.

Адсюль зусім відавочна, што калі і надалей будуць такія адносіны да будаўніцтва, як з боку тэхнічных кадраў так і з боку савецкіх і іншых грамадзкіх організацый, Белколгасбуд ні ў якім разе ня зможа выканаць програму будаўніцтва, чым паставіць пад пагрозу пасьпяховае вырашэньне проблемы разьвіцьця сьвінагадоўлі ў БССР.

Патрэбна палепшыць кіраўніцтва, кантроль і дапамогу ў выкананьні будаўнічых плянаў з боку раённых партыйных і комсамольскіх камітэтаў, райвыканкомаў і інш. раённых організацый, а таксама прыняць рашучыя крокі з тым, каб выканаць дырэктывы партыі і ўраду аб прыцягненьні да будаўніцтва вольных рабочых рук у колгасах, у зьвязку з скончэньнем работ па ўборцы ўраджаю, і гужтрудпавіннасьці для падвозкі будаўнічых матар'ялаў на месцы пабудовы сьвінарнікаў.

Неабходна зараз-жа ўжыць тэрміновыя меры да поўнай ліквідацыі маючыхся прарываў у выкананьні будаўнічай програмы.

Рыбакоў.



Плянамі абяцалі... а ў вініку...

Райвыканком не дапамагае

У саўгасе „Полелюм", Барысаўскі р-н, палова сьвіней стаіць у надзвычайна кепскіх умовах. Сагнаных па 15-20 штук у цесныя памяшканьні сьвіней дрэнна даглядаюць і кормяць.

Плян укомплектаваньня сьвінаматкамі на 20 лістапада выканан толькі на 25 проц.

Будаўніцтва сьвінарнікаў, якое распачата яшчэ ў чэрвені месяцы, да апошняга часу ня скончана. Колгасбуд, адгаварваючыся рознымі об'ектыўнымі прычынамі (недахват рабочых рук і інш.), ня прымае энэргічных мер для пасьпяховага скончэньня начатага будаўніцтва. Райвыканком і іншыя грамадзкія організацыі бязьдзейнічаюць. Грывеньскі, Чэрвеньскі і Забартоўскі с-с., якія павінны былі забясьпечыць падвозку матар'ялаў для будаўніцтва, ня прынялі ніякіх мер, каб выкарыстаць трудгужпавіннасьць. З-за незастаўкі на месца працы будаўнічага матар'ялу будаўніцтва сьвінарнікаў затрымліваецца.

За апошні час кіраўніцтва саўгасу прыняло тэрміновыя захады, каб прыстасаваць старыя памяшканьні для 20 сьвінаматак.

Брыгадзір ЦБ ЛКСМБ—
Дзьмітрыеў.

Спыніць зьдзекі над імпортнымі сьвінаматкамі

Вельмі марудна праходзіць будаўніцтва сьвінарніка ў саўгасе „Заречча". Замест патрэбных 100 рабочых, на пабудове працуюць толькі каля 20 чалавек.

Програма будаўніцтва далёка ня выканана.

Імпортным сьвіньням не забясьпечаны адпаведныя ўмовы. Іх разьмясьцілі ў часова прыстасаваных адкормачніках, дзе вельмі цесна, холадна. Імпортныя маткі ўжо пачалі парасіцца і ўсё яшчэ стаяць у адкормачніках, бо не падрыхтаваны матачнікі. Адсюль—яўная пагроза, што сьвінаводчы матар'ял папсуецца.

Прораб Круглоў, які кіруе пабудовай, нядбайна адносяцца да выкананьня програмы будаўніцтва. Няма ні працоўнай дысцыпліны, ні належнага нагляду за ходам пабудовы.

Партыйна-комсамольская ячэйка сельсавету ня прыняла амаль ніякіх мер, каб забясьпечыць больш пасьпяховае выкананьне програмы будаўніцтва і скласьці належныя ўмовы для гадоўлі імпортнай валютнай сьвіньні.

Брыгадзір ЦК ЛКСМБ ПІНСКІ.

Левін зрывае будаўніцтва

У саўгасе „Беларусь", Зас... скага раёну, будаўніцтва сьві... нікаў пачата яшчэ ў жніўні ме... цы, але да апошняга часу ня ск... чана. Тэхнік Белколгасбуду тав. ... він безадказна адносіцца да вы... наньня сваіх абавязкаў, ён дап... ціў шмат тэхнічных памылак, ... чаго папсавана вялікая кольк... каштоўнага будаўнічага матар'... Загадчык саўгасу, тав. Лапіцкі, ... сама нядбайна адносіцца да бу... ніцтва сьвінарнікаў.

Райвыканком і іншыя грамад... організацыі зусім ня цікавяцца ... даўніцтвам сьвінарнікаў. Яны ... дапамаглі сваечасова даставіць ... месца пабудовы будаўнічы матар...

150 сьвінаматак за адсутнас... прыстасаваных памяшканьняў р... мешчаны ў сьпехам зьбітым х... не ацепленым і брудным. А... і падзеж сьвінаматак. Нельга п... сьці і міма фактаў безадказных ... носін у справе догляду за сьві... маткамі. Сьвінаматак кормяць ... лоднай стравай. „Сьвінатрэст" ... прыняў энэргічных захадаў, ... забясьпечыць сьвінаводчыя саўг... катламі для варкі стравы сьві... ням.

Брыгадзір ЦК ЛКСМБ
ВІНАГРАДАЎ.

Нам пішуць

У 3-й Амсьціслаўскай яўрэйскай сямігодцы на чале самакіраўніцтва стаяць дзеці былых арандатараў, якія праводзяць няправільную працу. Дзякуючы гэтаму соц. спаборніцтва і самакрытыка не разгорнуты. Трэба райкому зацікавіцца становішчам гэтай школы.

Амсьціслаўль.

* * *

Увараўіцкая сялянская ячэйка ЛКСМБ вось ужо трэці месяц, як ня зьбіралася. Да гэтага часу не разгорнута політвучоба. Політычныя кампаніі праходзяць міма ячэйкі. Сакратар Карлоўскі ня цікавіцца працай комсамольскай ячэйкі. Райком комсамолу, хаця і ведае аб становішчы працы ячэйкі, але мала аб гэтым дбае.

Е.

* * *

Пры Вільшчанскай ШКМ існуюць грамадзкія організацыі як, напрыклад, т-вы „Прэч няпісьменнасьць" „Чырвоны Крыж", „Саюз ваяўнічых бязбожнікаў" і г. д., але ніякай працы не вядуць.

Комсамольскай ячэйцы трэба зьвярнуць на гэта належную ўвагу,

Дуняк.

* * *

Комсамольская ячэйка Вільшчанскай школы Койданаўскага р-ну не праводзіць належнай працы.

Сэкратар ячэйкі Аўцэвіч займаецца мордабоем, а ня працай. РК ЛКСМБ павінен зацікавіцца гэтай комсамольскай ячэйкай.

Дзерава.

* * *

У комсамольскім колектыве Віцебскага Белпэдтэхнікуму крытыка і самакрытыка не разгорнута, праца сярод насьценкораў і наогул корэспондэнтаў не праводзіцца, Добраахвотныя таварыствы не працуюць. Рост комсамольскай орканізацыі недастатковы.

Валентын [illegible]яновы.

* * *

У Калінкавіцкім РВК касір фінчасткі па-бюрократычнаму адносіцца да наведвальнікаў. Бываюць выпадкі, калі сяляне прыходзяць за 15 кілёмэтраў, каб здаць падатак, а той гаворыць:—„Я ня прымаю грошай, здайце ў сельсвет".

Кікім.


* * *

Школа ў вёсцы Дудзічах (Калінкавіцкі р-н) яшчэ не працуе, бо няма настаўнікаў. Райінспэктар не ўдзяляе гэтай школе належнай увагі.

Кікім.

ШАХМАТЫ І ШАШКІ

Шашачная задача



Шашачная задача—гэта такое становішча, калі белыя павінны незалежна ад гульні чорных заперці адну альбо некалькі шашак. Колькасьць запіраемых шашак абгаварваюць пры задачы. На дыяграме надрукавана задача: белыя павінны заперці адну простую. Як яе разьвязаць?

Прозьвішчы даслаўшых да 15 сьнежня правільнае разьвязаньне будуць надрукаваны.

Усебеларускі шашачны турнір

ЦСПСБ сумесна з ВСФКБ праводзяць усебеларускі шашачны турнір для выяўленьня ўдзельнікаў вялікага шашачнага чэмпіёнату СССР, які пачынаецца ў Маскве 10 сьнежня.

Спаборніцтва пачынаецца 1-га сьнежня ў клюбе будаўнікоў.

Курсы інструктароў

ЦСПСБ адчыняе ў Менску курсы шахматна-шашачных інструктароў. На курсы прымаюцца толькі сябры саюзу, Пачынаюць праводзіць курсы з 15 сьнежня.

Паштовая скрынка

Куперману — „Што думае ... Пламя—„Самавольства і ўпарта... М. Сталёваму—„Адмяніць гала... скую пастанову", Алоўку — „Н... хват шкла", Алёшы Ш.—„Опор... стычная практыка", Зоркаму—„Р... ком не працуе і ня думае праца... Ст.—„Вайна няпісьменнасьці", Гр... студэнтаў—„Заядаюць вошы", Цел... скаму—„Безназоўн е", Райнесу—... вырашыць пытаньне", Каразуну—... як", Харытановічу—„Коопэрацы... дапамагаюць"—пералічаныя допісы ... кіраваны ў адпаведныя ўстановы ... расьсьледваньня і рэагаваньня.

Анісенкаву—„Больш увагі Д... су"—Ліпневічу—„Важная справа ... вальваецца", У—Л. — „Заглянеце ... Саюзхлеб", Кавалеры—„Правы о... тунізм на практыцы", Чавуск... „Пашукаюць шчасьця", Вока—... галавацяпства зрыў" — ня пойд... Агульныя разважаньні.

М. Радзюку, Клімянюку, Загад... школы—вашы допісы ня пойд... Выклікі не зьмяшчаем.

Паведамленьне

Сёньня, 8-га сьнежня, а 6-й ... дзіне ўвечары ў памяшканьні ... ЛКСМБ адбудзецца пашыранае ... сяджэньне ЦБ ДКО разам з РБ ... г. Менску па пытаньню аб ... баявога агляду організацыі.

Заслуханы будуць інфор... баз: Політэхнікуму, Белдзяр... „Кастрычнік", Харчавікоў, М... стых (па Фрунзэўскай ор-цыі), ... гуначнікаў, Хэмікаў, Сампрамс... Шклозаводу, з-ду „Бальшавік" (... Кастрычнікаўскаму раёну).

На пасяджэньне выклікаюцца ... вадыры пералічаных баз і ... даў, сябры Кастрычнікаўскага ... Фрунзэўскага РБ ДКО.

Запрашаюцца на пасяджэ... павадары атрадаў і фарпасто... Менску.

ЦБ ДКО пры ЦК ЛКСМБ

АДКАЗНЫ РЭДАКТ...
РЭДКОЛЕГ...

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599